УДК 902/904

# ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНАЙ РАЗВЕДКІ Ў ВАКОЛІЦАХ в. БАГУШОЎКІ (ГРОДЗЕНСКІ РАЁН) У 2024 г.

*Гаршкоў Аляксандр Дзмітрыевіч*
старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»,
кандыдат гістарычных навук
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вынікам археалагічнай разведкі ў ваколіцах вёскі Багушоўкі (Гродзенскі раён) у 2024 г. У навуковы зварот уводзяцца матэрыялы пяці адкрытых аб'ектаў, якія адносяцца да перыядаў ад каменнага веку да Новага часу.*

Вясной і восенню 2024 г. аўтарам артыкула ў межах работы студэнцкай навукова-даследчай археалагічнай лабараторыі ГрДУ імя Янкі Купалы і выканання гранта БРФФД-Навука М № Г24М-005 "Палеаэканамічныя аспекты жыццядзейнасці паляўнічых-збіральнікаў фінальнага палеаліту ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана" былі праведзены археалагічныя даследаванні ў ваколіцах в. Багушоўка (Гродзенскага раёна). Мэтай разведкі з'яўлялася пошук новых помнікаў каменнага веку на тэрыторыі Гродзенскага ўзвышша, а менавіта стаянак фінальнапалеалітычнага часу. У выніку праведзеных работ было адкрыта пяць новых археалагічных аб'ектаў, апісанню якіх і прысвечаны наш артыкул.

Вёска Багушоўка Гродзенскага раёна размешчана ў паўночна-заходняй частцы Гродзенскага ўзвышша. Рэльеф дадзенага фізіка-геаграфічнага рэгіёна пераважна прадстаўлены ўзгорыста-ўвалістымі формамі, якія сфармаваліся ў час сожскага этапа прыпяцкага зледзянення. Па гэтай прычыне ў ваколіцах вёскі вядомы радовішчы глін і суглінкаў. Праз Багушоўку працякае рака Вежбалоўка, якая з'яўляецца правым прытокам р. Гожкі. Аднак уласна археалагічная разведка праводзілася на водападзеле Вежбалоўкі і яшчэ аднаго правага прытока Гожкі – р. Чарнухі.

Помнік *Багушоўка 1* размешчаны на паўночна-заходняй ускраіне вёскі, за 0,24 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў "Багушоўка", на ворыўным полі. Памеры – 120 х 110 м. Калекцыя сабраных матэрыялаў на помніку складаецца з адшчэпа рэтушаванага, разца бакавога, абломка рэтушаванага, фрагмента сценкі кругавога начыння паліванага, фрагмента донца і фрагмента сценкі шкляных вырабаў.

Помнік *Багушоўка 2* размешчаны 0,85 км ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі, за 0,5 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў "Багушоўка", на ворыўным полі. Памеры – 280 х 125 м. Калекцыя, сабраная на помніку, складаецца з 3 фрагментаў жаўлакоў са слядамі апрацоўкі; прэнуклеуса; 4 нуклеусаў; рэшткавага фрагмента нуклеуса; 7 адшчэпаў і фрагментаў адшчэпаў; адшчэпа і фрагмента адшчэпа рэтушаваных; 2 абломкаў рэтушаваных; 2 фрагментаў сценак кругавых пасудзін.

Месцазнаходжанне крамянёвых матэрыялаў *Багушоўка 3* размешчана 0,95 км ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі, за 0,68 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў "Багушоўка", на марэнным пагорку ў ворыўным полі. Памеры – 180 х 95 м. Выдзелена ў асобны пункт, так як мае адрознае тапаграфічнае размяшчэнне і матэрыялы. На помніку былі знойдзены чатыры крамянёвыя прадметы: фрагмент крамянёвага жаўлака рэтушаванага; адшчэпа скарыністага рэтушаванага і адшчэпа падскарыністага са слядамі біфасіяльнай апрацоўкі і рэтушы; адшчэп рэтушаваны (скрабло?). Усіх іх аб'ядноўвае стан захавання, які прадстаўлены белай глыбокай пацінай, слядамі забітасці па некаторых краях і люстражом.

Помнік *Багушоўка 4* размешчаны 1,1 км ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі, за 0,95 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў "Багушоўка", на ворыўным полі. Памеры – 160 х 100 м. Сабраная калекцыя прадстаўлена рэшткавым фрагментам нуклеуса з участкам рэтушы, адшчэпам, пракруткай з вылучаным джалам, 2 адшчэпамі і фрагментам адшчэпа рэтушаванымі, скрабачом або крэсіўным крэменем.

Найбольш багатым сярод усіх аб'ектаў з'яўляецца помнік *Багушоўка 5*, які размешчаны 1,5 км ад паўночна-заходняй

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ускраіны вёскі, за 1,3 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў “Багушоўка”, у нізіне на ворыўным полі. Памеры – 160 х 100 м. Агульная колькасць сабранай калекцыі складаецца з 78 адзінак. Агульная колькасць сабранай калекцыі складаецца з 78 адзінак. Яна прадстаўлена 5 жаўлакамі і фрагментамі жаўлакоў са слядамі апрацоўкі; 2 прэнуклеусамі; нуклеусам і рэшткавым фрагментам нуклеуса; 4 рабрыстымі адшчэпамі і пласцінамі і фрагментамі аналагічных; 2 падрабрыстымі пласцінамі (адна з іх рэтушаваная); сколам аднаўлення фронта нуклеуса; сколам патанчэння плоскасці сколвання; 34 адшчэпамі і фрагментамі адшчэпаў; пласцінай; 7 лускавінкамі; 10 адшчэпамі рэтушаванымі і фрагментамі аналагічных; пласцінай рэтушаванай; наканечнікам або яго нарыхтоўкай; пракруткай; уніфасіяльнай і фрагментамі біфасіяльнай прыладамі; 2 абломкамі; фрагментамі венчыка і шыйкі кругавых пасудзін.

Атрыманыя пад час паверхневых збораў калекцыі на помніках *Багушоўка 1-5* дазваляюць абазначыць этапы засялення дадзенай мясцовасці. На ўсіх зафіксаваных аб’ектах прысутнічаюць фрагменты кругавых пасудзін і вырабаў са шкла (Багушоўка 1), якія маркіруюць жыццядзейнасць чалавека ў дадзенай мясцовасці ў наважытны перыяд. Пры гэтым на картах канца XIX – першай паловы XX ст. населеныя пункты на дадзенай тэрыторыі адсутнічаюць.

Наступны блок матэрыялаў, якія фіксуюцца на помніках, гэта артэфакты, атрыманыя ў выніку прымянення біпалярнай (контрударнай) тэхнікі расшчаплення. Да гэтай групы адносяцца нуклеусы аднапляцовачныя (Багушоўка 2) і двухпляцовачны (Багушоўка 5) ад адшчэпаў; некаторыя адшчэпы, у якіх не прасочваюцца пяткі, адсутнічаюць яскрава выражаныя ўдарныя бугаркі і прысутнічаюць добра чытаемыя хвалі на вентральнай паверхні. Такая тэхналогія расшчаплення характэрна для бронзавага часу.

Перыяд фінальнага палеаліту прадстаўлены знаходкай наканечніка або нарыхтоўкі наканечніка чаранковай формы на помніку Багушоўка 5. Выкананы ён на падрабрыстым адшчэпе. Вастрыё сфармавана ў дыстальнай частцы нарыхтоўкі пры дапамозе паўстромкай рэтушы на вентральнай і дарсальнай паверхнях. Чаранок аформлены часткова, выдаленнем пяткі і ўдарнага бугарка шляхам адломвання. Падобная тэхналогія вырабу наканечнікаў характэрная для арэнсбургскай культуры, матэрыялы якой фіксуюцца ў іншых калекцыях на тэрыторыі басейна Немана [1, с. 95–96; 2, с. 88].

Акрамя гэтага, вельмі цікавымі, на наш пункт гледжання, з’яўляюцца матэрыялы з месцазнаходжання Багушоўка 3, якія прадстаўлены прадметамі з другаснай апрацоўкай. Іх знешнія характарыстыкі, а менавіта глыбокая белая, месцамі малочна-блакітная паціна, сляды забітасці і загладжанасці па краях, люстраж, могуць гаварыць пра даволі старажытны ўзрост дадзеных артэфактаў

Астатнія матэрыялы калекцый, якія прадстаўлены крамянёвымі прадметамі, датуюцца шырока – каменным-бронзавым вякамі.

Такім чынам, у выніку археалагічнай разведкі каля в. Багушоўкі Гродзенскага раёна ў 2024 г было адкрыта пяць новых археалагічных аб’ектаў. Сабраныя матэрыялы дазваляюць зафіксаваць на даследуемай тэрыторыі сляды жыццядзейнасці чалавека ў палеаліце(?), фінальным палеаліце, бронзавым часе і наважытнасці. Найбольш перспектыўнымі помнікамі для правядзення стацыянарных палявых работ, на наш пункт гледжання, з’яўляюцца Багушоўка 2-3, 5.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Гаршкоў, А. Д. Засяленне беларускай часткі басейна ракі Нёман у познеледавіковы час: новыя даныя і перспектывы даследавання / А. Д. Гаршкоў // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития : сб. науч. ст. / Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» ; гл. ред. В. А. Белозорович редкол.: Н. Л. Улейчик [и др.]. – Гродно : ГрГУ им. Янки Купалы. 2021. – С. 93–100.
2. Гаршкоў, А. Д. Выкарыстанне лука і стрэл носьбітамі арэнсбургскай культуры: агляд матэрыялаў / А. Д. Гаршкоў // IV Междунар. научно-практич. конф. молодых ученых “Вектор 3.0” = IV International Scientific and Practical Conference of Young Researcher “Vector 3.0” : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 17 апр. 2024 г. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2024. – С. 86–89.


**А** – месцаразмяшчэнне помнікаў у ваколіцах в. Багушоўкі. Нумары на карце адпавядаюць парадкавым. **Б** – Крамянёвыя матэрыялы, знойдзеныя падчас разведкі на помніку Багушоўка 5. 1 – пласціна (са слядамі ўтылізацыі); 2 – пласціна рэтушаваная; 3 – падрабрыстая пласціна рэтушаваная (нарыхтоўка разца(?)); 4 – наканечнік або нарыхтоўка падрабрыстая пласціна рэтушаваная (нарыхтоўка разца(?)); 4 – наканечнік або нарыхтоўка наканечніка (*малюнкі аўт.*)




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова